**Наталія Жывалкоўская**



**Загадчык сектара
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі**

# «МАЛАЯ РАДЗІМА – АПОВЕСЦЬ ЧАСОЎ»

*Нельга пераацаніць важнасць малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека. Там нашы карані, там прайшлі лепшыя дзіцячыя гады, там фарміравалася асоба. Такім жа ўсеабдымным, значным, без агляду на ўзрост і становішча ў грамадстве, павінен быць і наш удзел у лёсе дарагіх сэрцу мясцін. Яны павінны быць у прызме агульнай увагі, яны заслугоўваюць і заўсёды чакаюць клапатлівага стаўлення і стваральнага руху чалавечага патэнцыялу, яго асветніцкай, творчай ініцыятывы…*

*Наступны 2020 год – трэці і заключны Год малой радзімы. Гэта яшчэ адна магчымасць для нас праявіць сябе сапраўднымі, руплівымі гаспадарамі і праз канкрэтныя справы зрабіць для сваёй радзімы што-небудзь карыснае. Бібліятэкі розных узроўняў традыцыйна выступаюць цэнтральным звяном у захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, каштоўнай краязнаўчай інфармацыі. Гэта адбываецца, у тым ліку, у працэсе правядзення шырокамаштабных мерапрыемстваў: свят, акцый, праектаў, конкурсаў, тэматычных выставак і прэзентацый. Адным з шматлікіх мерапрыемстваў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прысвечаных Году малой радзімы, стаў выставачны праект «Малая радзіма – аповесць часоў», які складаўся з серыі мастацкіх і інфармацыйна-дакументальных выстаў. Нацыянальная бібліятэка Беларусі як каардынуючы метадычны цэнтр, у тым ліку ў галіне сацыякультурнай дзейнасці, прапануе сцэнарый афіцыйнага адкрыцця адной з фотаэкспазіцый беларускіх мастакоў пад назвай «Я сэрцам бачу», а таксама іншы тэматычны матэрыял для падрыхтоўкі падобных мерапрыемстваў – вытрымкі са сцэнарыяў, вершаваныя радкі, конкурсныя заданні…*

Перад пачаткам мерапрыемства для падмацавання тэматычнай атмасферы на плазменай панэлі паказваецца прэзентацыя фотаздымкаў жывапісных месцаў Беларусі і помнікаў архітэктуры, партрэтаў знакамітых людзей – творчыя працы ўдзельнікаў праекта. На фоне музыкі гучыць пранікнёны голас у запісе:

«Радзіма мая… Богам мне дадзеная і для мяне захаваная… Бацькаўшчына, Айчына, калыска, край родны…

У гэтых словах пульсуе жыццё многіх і многіх людзей і пакаленняў, родаў і асоб…

Словы гэтыя – сапраўдны і праўдзівы промень, святло, якое ажыўляе іператварае кожнага, хто прагне яго… як здарожаны і знябожаны падарожнік прыпадае да ратавальнай крынічкі. Гэтыя словы – несмяротныя, поклічныя, уздымныя і стваральныя! Ад веку і да веку, ад мінулага праз час сённяшні – да будучыні…

У іх – каханне, шчырасць і віна.., голас і рэха маёй душы, якая і памыляецца, і верыць, і любіць, і пакутуе...

У іх – надзея на светлае і прыгожае, на новыя сустрэчы і падзеі…

У іх – своеасаблівы дзённік і споведзь, справаздача і канспект яшчэ нязнанага...

З удзячнасцю, хваляваннем і надзеяй я кланяюся табе, мой родны куток, і бязмерна, бязмерна люблю…

***Гатовы гукавы файл можна знайсці па данай спасылцы https://yadi.sk/d/lsQ6RhlfklN39Q да 1.02.2020 г., альбо адправіць запыт на электронную пошту: jni@tut.by***

**Вядучая:**

Добры дзень, шаноўныя госці! Мы маем гонар вітаць вас на адкрыцці чарговага этапу праекта «Малая радзіма – аповесць часоў», у межах якога вашай увазе прадстаўлены фотапраект «Я сэрцам бачу» і інфармацыйна-дакументальная выстаўка «Тутэйшыя».

Гэта культурная акцыя прымеркавана да Года малой радзімы, вызначэнне якога з'яўляецца для нас, беларусаў, па-сапраўднаму сімвалічнай і трапяткой падзеяй, вельмі важнай для напоўненай мабільнасцю, імклівасцю і мітуснёй сучаснасці…

І як тут не ўзгадаць словы класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча «У родным краі ёсць крыніца Жывой вады..»

Верагодна, гэта Жывая вада і ёсць той своеасаблівы сімвал духоўнасці і яднання з роднай зямлёй, які надае людзям цудадзейнай сілы, адухаўляе творчасцю і радуе непаўторнымі знаходкамі. У ёй адлюстроўваецца любоў і шанаванне, гонар і захапленне, натхненне і стараннасць…

Менавіта гэтымі пачуццямі пранізаны і творы сучасных фотамастакоў, удзельнікаў сённяшняй экспазіцыі, і ўнікальныя калекцыі паштовак, і прадстаўленыя вашай увазе выданні з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Паважаныя сябры, распачаць нашу сустрэчу я запрашаю да мікрафона

*(выступленне госця, афіцыйнай асобы)*

**Вядучая:**

Вядома, што кожны творчы праект – гэта адказная сумесная праца вялікай колькасці захопленых адной ідэяй людзей, аматараў і прафесіяналаў сваёй справы. І ён адбываецца запатрабаваным і пераканаўчым толькі ў тым выпадку, калі кожны ўдзельнік укладвае ў працэс яго стварэння сваё сэрца, натхненне, майстэрства і працавітасць.

Выставачны праект «Малая радзіма – аповесць часоў», які праходзіць у тры этапы, ужо выклікаў агульную грамацкую цікавасць. Яго ідэйны прынцып – праяўленне клопату, энергіі любві да роднага краю праз канкрэтную творчую справу – не пакідае абыякавым нікога, з'яўляецца для новых пакаленняў прыкладам сапраўднага патрыятызму і робіць творчую акцыю вельмі паўнаважнай і прадстаўнічай!

Мы шчыра дзякуем удзельнікам сённяшняй выставы
і просім падзяліцца ўражаннямі ад убачанага нашага пачэснага госця
*(выступленне дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, дэпутата, ганаровага грамадзяніна горада, раёна і т. п.)*

**Вядучая *(на фоне музыкі і прэзентацыі фотаздымкаў)*:**

Мая зямля завецца Беларуссю.
Яна, як спадчына, мне ад дзядоў.
Дзе б ні была, а сэрцам я гарнуся
да ніў яе, да волатаў-дубоў.
Да траў мурожных нізенька схілюся –
дае мне сілу родная зямля.
Дзе я ні буду – да яе вярнуся,
яна – мая, да скону – уся мая…

Паважаныя сябры, згадзіцеся, быццам цяплом саграваюць душу вобразы прыгожых куточкаў Беларусі, прадстаўленных на фотаздымках экспазіцыі. Вось бацькоўская хата – акрайчык зямнога раю, дзе жылі продкі. Там Свет і Любоў, Існасць і Дабро… Вось рэчка – крыніца ачышчэння, лес, бязмежныя абшары палей, дзе зямля нараджае буйны хлебны колас… Менавіта гэтыя, нібыта звычайныя вобразы сталі для многіх беларусаў самымі блізкімі і святымі. Усё гэта – імгненні і вечнасць, адзначаныя воляй Божай, сплеценыя нябачнай, дужа моцнай ніткай – цягне да сябе ўсё жыццё...

Вядомы беларускі пісьменнік і драматург Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч апісаў гэтае прыцягненне так: «Кожнае Божае стварэнне прывязваецца да роднага кута, у якім, выходзячы з мацярынскага лона, выдала першыя гукі, у якім, падтрыманае чулымі, клапатлівымі рукамі бацькоў ставіла першыя крокі».

Колькі сэнсу і мілагучнасці ў гэтых радках!.. Як і ў мелодыі, якую вы пачуеце зараз
у выкананні інструментальнага ансамбля
*(творчы нумар)*

**Вядучая:**

Вялікі дзякуй і нашыя апладысменты музыкам за падтрымку цудоўнай светлай атмасферы нашай сустрэчы!

Як вядома, беларуская зямля ва ўсе часы адкрывала свету выдатныя імёны ў культуры, літаратуры, навуцы, дзяржаўным кіраванні… Сваім талентам, высакароднымі намаганнямі і руплівай працай яны ўслаўляюць сваю Радзіму, натхнёныя вялікай любоўю і пяшчотай да яе…

Вельмі прыемна, што да ўдзелу ў нашым праекце адгукнулася вялікая колькасць вядомых і яшчэ пачынаючых майстроў фотамастацтва. У кожнага – свой адметны стыль, свой погляд і ўспрыманне навакольнага свету, свае вобразы… Кожны з іх – своеасаблівы фільтр, які прапускае праз сябе ўсё ўбачанае і ўкладае ў творчы вынік частку сваёй душы, сапраўдную шчырасць і глыбокія пачуцці…

Яшчэ раз вітаем апладысментамі ўсіх удзельнікаў выстаўкі і запрашаем да мікрафона
*(выступленне фотамастака, удзельніка выставы)*

**Вядучая:**

У Сусвеце плыве вялікая прыгожая планета Зямля. На ёй жывуць шмат людзей, але кожны адчувае сэрцам, дзе яго Малая Радзіма…

Кожны з нас павінен задаць сабе пытанне: што я зраблю сёння і цяпер для сваёй адзінай Радзімы, як пражыву сваё жыццё, каб не было сорамна ні мне самому, ні маім родным і блізкім людзям?..

Шаноўныя сябры, вельмі хочацца, каб наша таленавітая і актыўная моладзь – найвялікшы здабытак Беларусі – імкнулася зрабіць яе прыгожай і квітнеючай!

Каб у сваіх сэрцах вы назаўсёды захавалі гордасць, павагу і любоў да сваёй зямлі, каб памяталі і бераглі родныя мясціны, дзе застаецца назаўжды сэрца кожнага з нас.

Мы жадаем вам міру і згоды ў вашых сем'ях, дзякуем за ўдзел і цёплую атмасферу нашай сустрэчы, прапануем пазнаёміцца з экспазіцыяй і адчуць сябе як дома!

Усяго найлепшага і да новых сустрэч!

*(Гучыць інструментальная музыка. Удзельнікі мерапрыемства знаёмяцца з экспазіцыяй)*

*Прапаную таксама інтэрактыўны матэрыял для літаратурных конкурсаў і тэматычных урокаў.*

1. Прыказкі і прымаўкі раздаюцца ўдзельнікам мерапрыемства. Яны дапаўняюць іх да поўнага тэксту і тлумачаць сэнс.

*Няма смачнейшай вадзіцы… (як з роднай крыніцы).*
*Дарагая тая хатка… (дзе нарадзіла мяне матка).*

*Родная зямля – маці… (чужая старонка – мачыха).*
*Усюды добра – а дома … (лепей).*
*Жыць – Радзіме … (служыць).*
*Роднаму зямелька, як зморанаму – …(пасцелька).*
*У сваім краі, як… (у раі).*
*Родная зямля мякчэй чужой… (пярыны).*
*На чужой старане не сагрэе і … (сонца).*
*Той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна… (служыць).*
*Бацькоў не цурайся, а ад Радзімы… (не адракайся) і інш.*

2. Па наступных паэтычных радках трэба вызначыць літаратурны твор і яго назву.

*У любімай мове, роднай, наскай,*
*Ах, якія словы: «Калі ласка!..»*
*Як звіняць яны сардэчнаю струною,*
*Праз усё жыццё ідуць са мною.*
*Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:*
*– Калі ласка, калі ласка, у хату!*
***П. Броўка. «Калі ласка».***

*Па-над белым пухам вішняў,*
*Быццам сіні аганёк,*
*Б'ецца, уецца шпаркі, лёгкі*
*Сінякрылы матылёк.*
***М. Багдановіч. «Маёвая песня».***

*Між алешын, кустоў,*
*Дзе пяе салавей,*
*І шуміць, і грыміць*
*Срэбразвонны ручэй.*
***Я. Колас. «Ручэй».***

*Паміж пустак, балот беларускай зямлі,*
*На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай*
*Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –*
*Ўдзірванелы курган векавечны.*
***Я. Купала. «Курган».***

*Ніхто з дамашніх не згадае,*
*Чым рэчка Костуся звабмае,*
*Якая іх звязала сіла*
*І чым яна так хлопцу міла.*
***Я. Колас. «На рэчцы».***

*Дзесьці ў прасторах*
*празвінелі бомы.*
*Дацвілі пялёсткі*
*нейчае тугі...*
*І здаецца зноўку –*
*еду я дадому*
*Пераведаць родных,*
*блізкіх, дарагіх.*
***П. Трус. «Падаюць сняжынкі».***

3. Дапісаць ці агучыць наступныя вершаваныя радкі і назваць іх аўтараў.

*«Радзіма мая дарагая,*
*Ты...»*
***Алесь Бачыла.***

*«Каб любіць Беларусь нашу мілую,*
*Трэба...»*
***Алесь Ставер.***

*«Трэба дома бываць часцей,*
*Трэба...»*
***Рыгор Барадулін.***

Summary

The script and guidelines on the topic.